# ЕЎРАПЕЙСКАЯ ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА XVII-XVIII СТСТ.



Настаўнік: Міхаіл Сяргеевіч Будаеў
ДУА «Скірмантаўскі ВПК ЯС-СШ»

# ПЛАН УРОКА

1. Дасягненні барока
2. Вялікія мастакі XVII ст.
3. Дасягненні класіцызму
4. Ідэі Асветніцтва ў літаратуры XVIII ст.
5. Дасягненні музычнага мастацтва

# УЗГАДАЕМ!

- Што такое «Рэнесанс»? Якія яго асноўныя ідэі і характэрныя рысы?
- Што такое «Асветніцтва»? У чым яго асаблівасці і адметнасці?

# ДАСЯГНЕННІ БАРОКА

- Слова «Барока» перакладаецца з італьянскай як «дзіўны», «мудрагелісты». Як вы лічыце, якія асаблівасці могуць існаваць у гэтага стыля, улічваючы такі пераклад?
- Знойдзем характарыстыку мастацкага стыля ў вучэбных дапаможніках (ст. 92)
- АДКАЗ: Для барока характэрныя веліч і пышнасць, імкненне ўздзейнічаць на пачуцці чалавека. У мастацтве барока цесна перапляталіся рэальнае (сапраўднае) і ўяўнае. Творы гэтага стылю напоўненыя рухам і кантрастамі. Вялікае значэнне ў іх маюць відовішчнасць і дэкаратыўнае аздабленне. У стылі барока ствараліся парадныя партрэты, дэкаратыўны жывапіс і скульптура, паркавыя і палацавыя ансамблі, культавая (рэлігійная) архітэктура. Гэты стыль пашырыўся таксама ў літаратуры: паэзіі, прозе, драматургіі.



Плошча Святога Пятра (Рым)

Фантан Трэві (Рым)



# ДАСЯГНЕННІ БАРОКА

- **Знайдзіце адказ:**
- У якіх краінах у большай ступені распаўсюдзіўся стыль «барока»?

- Барока было пераважным стылем перш за ўсё ў тых краінах, дзе панавала каталіцкая царква (Італія, Іспанія, германскія дзяржавы, Польшча і іншыя дзяржавы)

# ВЯЛІКІЯ МАСТАКІ XVII СТ.

- Работаем над складаннем табліцы «Вялікія мастакі». Замалюйце табліцу ў сшытку:

| **Імя мастака** | **Караваджа** | **Дыега Веласкес** | **Пітэр Паўль Рубенс** | **Рэмбрант** |
|---|---|---|---|---|
| Хар-ка творчасці | | | | |


smallbay.ru







# ДАСЯГНЕННІ КЛАСІЦЫЗМУ

- З якім мастацкім стылем мінулага цесна звязаны класіцызм?
- Што ў перакладзе з лацінскай мовы азначае слова «classicus»?
- Якім, на думку прыхільнікаў класіцызму, павінна быць мастацтва?

- Шукаем адказы на ст.95

# АСНОЎНЫЯ РЫСЫ КЛАСІЦЫЗМУ



# ГРО АНТУАН ЖАН «НАПАЛЕОН БАНАПАРТ НА АРКОЛЬСКІМ МАСЦЕ»



Паспрабуйце суаднесці мастацкія асаблівасці гэтай карціны з характэрнымі рысамі класіцызму

# ДАСЯГНЕННІ КЛАСІЦЫЗМУ

- Класіцызм атрымаў распаўсюджванне ў самых разнастайных відах мастацтва

КЛАСІЦЫЗМ

ЛІТАРАТУРА

МУЗЫКА

ТРАГЕДЫЯ

ОПЕРА

КАМЕДЫЯ

# ІДЭІ АСВЕТНІЦТВА Ў ЛІТАРАТУРЫ XVIII СТ.

У XVIII ст. на змену махлярскаму раману, у якім апавядалася пра прыгоды спрытнага прайдзісвета і авантурыста, прыйшоў асветніцкі, павучальны, выхаваўчы раман. Літаратурныя творы таго часу былі напоўненыя крытычным, філасофскім зместам. З'явіліся раманы ў пісьмах, споведзі, дзённікі

## Ідэі Асветніцтва ў літаратуры Заходняй Еўропы

| Пісьменнік | Назвы твораў | Сутнасць твора |
|---|---|---|
| *Даніэль Дэфо*, англійскі пісьменнік | Раман «Рабінзон Круза» | Гэты раман напісаны ў форме дзённіка, дзе герой распавядае пра тое, што адбывалася з ім на бязлюдным востраве. Даніэль Дэфо ўслаўляў стваральную працу чалавека, яго прадпрымальнасць, упартасць у дасягненні мэты |
| *Джонатан Свіфт*, англійскі пісьменнік | Раман «Падарожжы Гулівера» | Гэты раман — не проста займальны, прыгодніцкі твор. Гэта яшчэ і дасціпная сатыра на тагачаснае грамадства. Свіфт бязлітасна крытыкуе заганы грамадства: самадурства, сквапнасць |
| *П'ер дэ Бамаршэ*, французскі драматург | Камедыі «Севільскі цырульнік» і «Жаніцьба Фігаро» | Творы Бамаршэ прасякнутыя асветніцкімі матывамі. Галоўны герой абодвух твораў — слуга Фігаро, спрытны, таленавіты і дзёрзкі. Ён супрацьпастаўляецца пустым гультаям арыстакратам |
| *Фрыдрых Шылер*, нямецкі паэт і драматург | Трагедыя «Разбойнікі» | У трагедыі паказаныя маладыя людзі, якія сталі разбойнікамі ў знак пратэсту супраць тагачасных парадкаў |
| | Драма «Вільгельм Тэль» | У драме ўсхваляецца барацьба швейцарцаў супраць аўстрыйскіх Габсбургаў. Галоўнымі героямі твора сталі простыя людзі: пастухі, рыбакі, паляўнічыя |
| *Іаган Вольфганг Гётэ*, нямецкі пісьменнік | Драма «Гёц фон Берліхінген» | Драма прысвечаная Сялянскай вайне. У творы намаляваны вобраз героя — абаронцы ўсіх прыгнечаных і барацьбіта за аб'яднанне Германіі |
| | Раман у лістах «Пакуты юнага Вертэра» | Галоўны герой рамана — адукаваны юнак з бюргерскай сям'і, які пакутуе праз фанабэрыстасць дваран і крывадушнасць грамадства |

# ДАСЯГНЕННІ МУЗЫЧНАГА МАСТАЦТВА



І.С.Бах



В.А.Моцарт

# ПАДВЯДЗЕМ ВЫНІКІ

- Якія асноўныя паняцці былі засвоены на сённяшнім уроку?
- З якімі вядомымі дзеячамі мастацтваў мы сёння пазнаёміліся?
- Які напрамак у мастацтве спадабаўся вам больш астатніх?

- Дамашняе заданне: §15, заданні ў рабочым сшытку


прэзентацыя скончана
дзякуй за увагу
memesmix.net